## Гульня-віктарына “Сустрэча з казкай”

Задачы: пашырыць уяўленні дзяцей аб вуснай народнай творчасці, выклікаць жаданне чытаць беларускія народныя казкі, творы на беларускай мове; фарміраваць павагу да спадчыны беларускага народа; садзейнічаць выхаванню дабрыні, узаемадапамогі, міласэрнасці, працавітасці, сумленнасці.

Ход віктарыны

Па ўсім свеце, з краю ў край
Ходзіць мудры, добры Бай.
З казак , баек ён сатканы.
Бай усюды госць жаданы.
Дарагі, ласкавы Бай,
Кожны дзень нам казкі бай!

Н. Галіноўская

Так, сёння будзе шмат розных заданняў і пытанняў па беларускіх народных казках, а пераможцу нашага спаборніцтва мы высветлім з дапамогай каляровых фішак. За правільны адказ вы атрымаеце фішку.

1. **Прадоўжыце назвы бел.нар. казак:**

“Музыка- _________”, “Лісіца і ______”, “Два ________”, “Хітры _______” , “Баран _________”, “Кот __________”.

**2. Пазнайце казку па пачатку :**

А) “Жыў некалі насвеце музыка. Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасучы валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы скубці траву перастануць, - натапыруць вушы і слухаюць. У лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ў балоце не крумкаюць.”

Б)“Быў такі час на зямлі, калі звяры не мелі хвастоў. Заязь страшэнна дакучала ім: абараніцца звяры не мелі чым. І вось аднойчы ад ляснога цара выйшаў загад, каб звяры ішлі хвасты атрымліваць. Пайшлі ганцы ўва ўсе канцы з пушчаў, лясоў і палёў склікаць звяроў. Паведамілі ваўка, лісіцу, куніцу, пабудзілі і мядзьведзя ў яго бярлозе.

- Добра, - кажа Мішка: - я зараз прыйду, адно загляну да старое ліпы, ці не знайду там чаго паснедаць”.

В)“Былі ў аднаго чалавека тры сыны: два разумныя, а трэці — дурны.

Старэйшы сын, Сцяпан, умеў на скрыпцы іграць, сярэдні, Піліп,— на дудцы, а меншы, Іван, ні да чаго спрыту не меў: сядзеў у запечку ды лучынкі stругаў.

Вырасла ў таго чалавека ў садзе яблынька, а на ёй — залатыя яблыкі. Цешыцца бацька з яблыкаў, і сыны цешацца. Кожную раніцу ў сад ходзяць глядзець, ці цэлыя.

Праверылі гэтак аднаго разу — не хапае яблыка! І на другую раніцу не далічыліся аднаго яблыка...”

**3. Пазнайце казку па канцоўцы:**

А) “- Схітрыў ці не схітрыў, -адказаў вол, - а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася”.



Б)“… Выслухаў мядзьведзь казку і адарваў сабе хвост.

Так з таго часу і жыве з куртатым хвастом”.

**4. Назавіце тры добрыя справы, якія зрабіў малодшы брат Іван у бел.нар казцы “Два браты”.**

**5. Каму належаць наступныя словы? Назавіце галоўных герояў і назву казкі:**
“-Танцуй сабе, а з’есці я цябе яшчэ паспею… вось дык Гусак! Вось дык танцор!”

**6. Якому герою належаць наступныя словы :**
“Ідзі, Іван-бядняк , на бераг мора, схавайся пад човен і дачакайся ночы. Прыляцяць тры мае сыны, тры вораны. Пачнуць між сабою гаварыць. Слухай іх і запамінай. Толькі глядзі, не абзывайся”.



**7. Што адбылося перад апісанай падзеяй? З якіх казак гэты ўрывак?**
“…Так і засталася лісіца з разяўленым ротам”

**8. Да якой казкі падыходзяць прыказкі?**
- Хто працуе, той не сумуе.
- Язык у разумнага ў галаве, у дурнога – на зубах.

**9. Назавіце адмоўных герояў у беларускіх народных казках “Хітры вол”, “Лісіца і Гусак”.**

**10. Назавіце назву казкі, у якой дзяўчына зрабіла так:**
“- Чаму я тут, у бруднай мужыцкай хаце, ляжу?

- Ты сам так захацеў, - смяецца дзяўчынка. - Ты сказаў мне: «Бяры сабе з маёнтка, што пажадаеш, ды ідзі дахаты». Я і ўзяла цябе. Уставай ды ідзі замест бацькі паншчыну адбываць. Ты мужык дужы, роботнік з цябе будзе нядрэнны.

Пачуўшы гэта, пан усхапіўся на ногі і так драпануў назад у свой маёнтак, што толькі яго і бачылі. Навет ад коней з карэтаю адрокся”.

**Вызначэнне пераможцы ў конкурсе знаўцаў казак.**
Дзеці падлічваюць колькасць фішак. Узнагароджваецца пераможца.

Жадаю вам хутчэй расці,
Ды помніць , майце ласку,
Хай будзе ў вашым у жыцці
Заўсёды месца казкам.
Гарэць цікаўнаму агню
Заўжды паможа казка.
Ды ў светлым сэрцы дабрыню
Шануйце, калі ласка.